*2.* 刘一乙.《社会主义核心价值观研究》. 安徽：中国科学技术大学, 2016. – 65 页 = *Лю, Йийи*. Исследование основных социальных ценностей / Йийи Лю. – Аньхой : Университет науки и техники Китая, 2016. – 65 с.

*3.* Поэзия бессмертных. Ли Бо [Электронный ресурс] // intelife. – Режим доступа: https://intelife.ru/tvorchestvo/poeziya/vostochnaya-poeziya4/item/307-poeziya-bessmertnykh-li-bo. – Дата доступа: 10.03.2020.

*4.* 梁新宇.《中秋万家团圆》. 广东：汕头大学出版社, 2017. – 122 页 = *Лян, Синью*. Праздник середины осени / Синью Лян. – Гуандун : Университетская пресса Шаньтоу, 2017. – 122 с.

*5.* 梁新宇.《清明祭祀之风》. 广东：汕头大学出版社, 2017. – 122 页 = *Лян, Синью*. Обычай жертвоприношения Цинмин / Синью Лян. – Гуандун : Университетская пресса Шаньтоу, 2017. – 122 с.

*6.* 梁新宇.《浪漫七夕佳期》. 广东：汕头大学出版社, 2017. – 122 页 = *Лян, Синью*. Романтический Фестиваль Ци Си / Синью Лян. – Гуандун : Университетская пресса Шаньтоу, 2017. – 122 с.

*7.* 王延信.《戏剧艺术的审美价值》. 江苏：美育学刊, 2015. – 第 5 期. – 8–15 页 = *Ван, Янсинь*. Эстетическая ценность театрального искусства / Янсинь Ван // Цзянсу Эстетический образовательный журнал. – 2015. – № 5. – С. 8–15.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***А. В. Катовіч,***
*старшы выкладчык кафедры рэжысуры*
*Беларускага дзяржаўнага*
*ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

# ЦЫКЛІЧНАЯ ПАЎТАРАЛЬНАСЦЬ АНТРАПАКОСМУ ЯК УНІВЕРСАЛЬНАЯ МАДЭЛЬ АКТУАЛІЗАЦЫІ КАСМАГАНІЧНАГА МІФА

У міфалагічнай канцэпцыі ўспрымання і парадкавання часу як адной з асноўных катэгорый светабудовы пераважае ідэя прыроднай **цыклічнасці**, адвечнай паўтаральнасці **аднойчы зададзенага рытму**, і, адпаведна, колазвароту жыцця чалавека. Відаць, якраз цыклічная паўтаральнасць космапланетарных і прыродных рытмаў стала той семантычнай асновай, на падставе якой узнікла паняцце часу ў рускамоўнай традыцыі. «Время» паходзіць ад індаеўрапейскага *uert-men*, дзе *uert-* азначае «вертеть, вращать», г. зн. апісваць кола.

Касмаганічны міф заўсёды адсылае нас да Свяшчэннага часу першастварэння, таму што практычна любая рэальнасць, звяза-

ная з жыццядзейнасцю чалавека на Зямлі, некалі была створана багамі, дэміургамі. Аднак, ствараючы прасторавую рэальнасць, багі маркіравалі і той першачас, Свяшчэнны час, які заўсёды надзяляецца асаблівым сацыяльным статусам, «таму што час, калі ажыццяўлялася Стварэнне, быў з неабходнасцю асвечаны наяўнасцю боскіх дзеянняў» [7, с. 49].

Выкарыстоўваючы архетыпы, міф пераносіць чалавека ў Свяшчэнны час першастварэння. М. Эліядэ надае архаічнаму міфу статус універсальнасці: абсалютна ўсё, што маркіруе антрапакосм соцыуму, напачатку было створана багамі: «Міф дэкларуе ўзнікненне якой-небудзь новай касмічнай сітуацыі або якой-небудзь першаснай падзеі. Такім чынам, гэта заўсёды аповед аб нейкім “стварэнні”: аб тым, якім чынам якая-небудзь рэч здарылася, г. зн. пачала існаваць. Вось чаму міф набліжаецца да анталогіі: ён апавядае толькі аб рэальным, аб тым, што рэальна адбылося, што ў поўнай ступені праявілася… Усё, што рабілі багі або продкі, а значыць, усё, пра што гавораць міфы аб іх стваральнай дзейнасці, належыць свяшчэннаму, г. зн. удзельнічае ў Быцці. Наадварот, тое, што робяць людзі па ўласным разуменні, без звароту да міфічнай мадэлі, належыць да сферы мірскога, а гэта – дзейнасць пустая, ілюзорная і, у рэшце рэшт, нерэальная» [7, с. 63–64].

К. Хюбнер, аналізуючы вытокі сюжэтаў грэчаскай міфалогіі, прыходзіць да высновы, што найбольш вызначальная іх рыса – уяўленні аб архе, пачатку ўсяго існага ў свеце: «Архе – гэта гісторыя паходжання. Калісьці нейкая нумінозная істота ўпершыню выканала пэўнае дзеянне, і з той пары гэта падзея ідэнтычна паўтараецца. У першую чаргу гэта тычыцца з’яў прыроды» [4, с. 122]. Зразумела, што пазней у сферу дзейнасці архе трапілі ўсе сферы жыццядзейнасці грамадства і найперш цыкл земляробчых работ. Фактычна кожнае рамяство або промысел, скіраваныя на забеспячэнне жыццядзейнасці чалавека, некалі былі ўпершыню здзейснены на нябёсах намаганнямі багоў. Аб лёсавызначальнай ролі міфа ў гісторыі чалавецтва М. Эліядэ гаворыць наступным чынам: «…функцыя міфа складаецца пераважна з таго, каб прадставіць мадэлі для пераймання падчас здзяйснення абрадаў і ўвогуле любых значных дзеянняў: правілы харчавання або шлюбу, працы і навучання дзяцей, мастацтва і навукі мудрасці. Гэта канцэпцыя асабліва

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

важна для разумення чалавека архаічных і традыцыйных грамадстваў» [5, с. 18].

Паняцце «архе», непасрэдным чынам звязанае з вытокамі светабудовы, можа справакаваць прадстаўніка сучаснага грамадства на пытанне аб часе яго ўзнікнення, далейшай суаднесенасці з часавым кантэкстам, асабліва калі зыходзіць з пазіцыі лінейнай формы парадкавання часу. Аднак, па словах К. Хюбнера, «архе з’яўляецца не толькі схемай тлумачэння нейкага працэсу, паколькі яно вызначае і стварае яго, але канстытуіруе і яго часавы ход: часавая паслядоўнасць падзей, якая ўзнікае ў архе, напаўняе яго зместам. Архе з’яўляецца, так бы мовіць, парадыгмай гэтай паслядоўнасці, якая паўтараецца бясконцым і ідэнтычным чынам. Гаворка ідзе аб ідэнтычным паўтарэнні, таму што гэта – адна і тая ж свяшчэнная першападзея, якая паўсюдна зноўку адбываецца. Гэта падзея літаральна зноў і зноў прыцягваецца ў свет, яна не з’яўляецца кожны раз новым варыянтам або серыйнай імітацыяй нейкага прататыпу. Думка аб тым, што Бог стане рабіць тое ж самае незлічоную колькасць разоў, была б несумяшчальнай з уяўленнем, якое склалася аб ім у людзей, і менавіта гэта паўтарэнне прападзеі, яго вечнасць у цяперашнім, складае яго святасць. Міфічны час з’яўляецца цыклічным у выніку гэтага ідэнтычнага паўтарэння падзей» [4, с. 128].

У сувязі з вышэйсказаным паўстае неабходнасць вырашыць важную метадалагічную праблему. На першы погляд, феномен часу – тая космапланетарная данасць, створаная міфічнымі багамі або, у больш позніх тэкстах, Богам, якая маркіруе не толькі пачатак існавання самога часу, але і яго вечную наяўнасць. Час Вечнасці ў такім разе павінен быць заўсёды самадастатковым, раўнавялікім і нерухомым. Час можа быць тоесным самой планеце Зямля, гарам, якія складаюць значную долю яе паверхні, рэкам, марам і акіянам, што фактычна застаюцца раўнавялікімі ў кантэксце жыцця чалавека і нават некалькіх пакаленняў. Аднак любое мора бясконца поўніцца водамі свайго Дуная-Дунаёчка: «Ці не цяжка табе, // Лука ў луку злучаючы, // Белы камень абмываючы, // Жоўты пясок узрываючы?» [1, с. 443]. Вобраз ракі ў беларускай баладзе «Муж-Дунай» набывае міфалагічнае гучанне ракі Вечнасці. Апынуўшыся ў складаным становішчы, дзяўчына прыходзіць да Дунаёчка, у якога ператварыўся яе суджаны. Рака зямная робіцца ўвасаб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

леннем часу Вечнасці, у якім шукаюць апірышча, падмогу, падтрымку. Але ж рака Абсалюту захоўвае сваю цэлакупнасць і нязменнасць паўнаты дзякуючы таму, што малады хлопец аддаў ёй сваю жыццёвую моц. Разрываючы будзённасць прафаннай плыні часу, рытуал запускае механізм сакралізацыі сітуацыі, у кантэксце якой ахвяраванне рацэ продкаў і найперш першапродкаў ёсць не што іншае, як абрадавае далучэнне да ракі часу Першастварэння. У беларускай міфапаэтычнай спадчыне існуе некалькі сюжэтных тыпаў міфалагічных балад, у якіх матыў «цмок забірае самую прыгожую дзяўчыну» з'яўляецца сюжэтаўтваральным. У гэтым міфалагічным сюжэце фактычна і закладзена адвечная дыхатамія сакральнага і прафаннага часу, асноўным пасрэднікам паміж якімі з'яўляецца рытуал. А час, калі прыйдзе дапамога, або час навалецця, суадносіцца з пачаткам вясны: «Судзі, божа, вясны даждаць» [1, с. 442].

Сакральныя міфалагічныя тэксты канстатуюць, што час Вечнасці, створаны Богам, вымагае штогадовага падсілкоўвання, аднаўлення энергіі стварэння, якую, па народных уяўленнях, могуць генерыраваць маладыя людзі перадшлюбнага ўзросту. У маштабны космапланетарны працэс захавання і аднаўлення часу ўключаецца чалавек, соцыум: «Міф уводзіць чалавека ў сітуацыю Свяшчэннага часу, часу Пачаткаў і Вытокаў – адзінага важнага, узорнага, крыніцы жыцця, сілы і энергіі, часу архетыпічных узораў і сапраўднага існавання. У сваёй мірской дзейнасці чалавек звяртаецца да гэтага часу для аднаўлення сіл і скарыстанай энергіі. У прыродзе чаргавання Свяшчэннага і мірскога часу закладзены механізм рытмічнага абнаўлення Космасу, здольнага да ачышчэння і ўваскрэсення… На прыродныя рытмы накладаюцца біялагічныя рытмы чалавечага існавання, таксама патрабуючага рэгулярнага аднаўлення. Для паспяховага працягу мірской дзейнасці чалавек павінен перыядычна паглыбляцца ў Свяшчэнны час Пачатку» [3, с. 25]. Менавіта гэта акалічнасць выразна адлюстравана ў абрадавай паэзіі беларусаў: матывы шлюбавін з'яўляюцца важнай складовай каляндарных песень-гімнаў, а ў вясельнай паэзіі значнае месца займаюць прыродныя паралелізмы.

К. Хюбнер і С. Д. Домнікаў акцэнтуюць увагу на тым, што ў феномен касмічнага часу закладзена своеасаблівая пульсацыя, рытмічная паўтаральнасць, якая дзейнічае па прынцыпе кола,



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

што разбягаецца па вадзе ад цэнтра ўзбуджэння: чым далей, тым болей змяншаецца амплітуда ваганняў, а адлегласць паміж затухаючымі хвалямі павялічваецца. У такім разе міф аб стварэнні свету і яго прыватных складовых частках дзякуючы архетыпічнаму кантынууму «вяртае чалавека да Свяшчэннага часу першапачатковага стварэння, заўсёды выступаючы як анталагічная канцэпцыя, свяшчэнная гісторыя, якая распавядае пра першапачатковую падзею, што адбылася ў пачатку Часу…» [3, с. 25].

Пульсацыя міфічнага часу, падмацаваная вобразам хвалі, прыводзіць нас да неабходнасці патлумачыць памер той часавай працягласці, у межах якой хваля канчаткова страціць энергію ўзбуджэння і перад соцыумам паўстане неабходнасць звароту да архетыпа і актуалізацыі свяшчэннага тэксту міфа з мэтай аднаўлення перыяду касмічнай цыклічнасці.

Міфы індаеўрапейскай сям'і народаў указваюць на тое, што галоўнай рухомай сілай цыклічнасці ў свеце было Сонца. Час абарачэння Зямлі вакол сваёй восі задаў тэмпаральнасць сутак, а вось час абарачэння нашай планеты вакол Сонца абумовіў тую класічную мадэль рытмічнасці, або цыклічнасці, працягласцю ў каляндарны год. Менавіта гэты адрэзак часу пакладзены ў аснову пераважнай большасці сусветна вядомых каляндарных сістэм, а таксама з'яўляецца той універсальнай касмічнай працягласцю, якая была задумана Богам і стала квінтэсенцыяй архетыпа першастварэння. С. Д. Домнікаў слушна сцвярджае, што салярны «год ператвараецца ў вызначальны сімвал касмічнай цыклічнасці ў эпоху складання земляробчай культуры» [3, с. 107], а сам па сабе касмаганічны міф ёсць не што іншае, як «узор касмічнага цыклу» [3, с. 107]. Рытму прыроднакасмічных змен была падпарадкавана і жыццядзейнасць соцыуму. З цягам часу яна таксама набыла цыклічную паўтаральнасць, якая прывяла да ўзнікнення align рознага роду каляндарных сістэм, адной з асноўных сярод іх аказалася дакладнае парадкаванне сельскагаспадарчых, перш за ўсё земляробчых, работ. Кожны новы від дзейнасці (аб'езд маладых коней на Масленіцу, мыццё дзяжы ў Чысты чацвер, агляд пчол на Саракі, першы выган хатняй жывёлы на пашу на Юр'я і інш.) або чарговы этап у вегетатыўным цыкле збожжавых культур (напрыклад, калі колас «завіваўся ў трубы») суправаджаўся адпа-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ведным рытуальна-абрадавым комплексам, разгорнутым у той ці іншай кропцы гадавога колазвароту. Структураўтваральным стрыжнем каляндарнага парадкавання часу быў рух Сонца па небасхіле, у якім чатыры фазы вылучаліся і маркіравалі новую пару года, а прамежкавы стан паміж імі практычна адпавядаў пераходам адной пары года ў іншую. «Чатыры крытычныя кропкі гадавога кола – найбольш значныя, урачыстыя, але і найбольш небяспечныя моманты, перыяды своеасаблівага «спынення часу», разрыву часавага патоку, звязанага з актывізацыяй касмічных сіл (як вышэйшых сіл Неба, так і цёмных сіл Хаосу). Заканчэнне аднаго касмічнага этапу прадугледжвае пачатак іншага. Разрыў у часе актуалізуе ідэю пераходу, што падкрэслівае свяшчэннасць гэтых часавых межаў. Змешванне стыхій сімвалізуе вялікае таінства апладнення свету ў імя пачатку новага касмічнага этапу. Гэта час касмічнага колазвароту… У гэтыя моманты адбываецца свайго роду “згортванне” Космасу, вяртанне яго ў эмбрыянальны стан, у якім “усё адзінае” – сімвалічны шлюб Неба і Зямлі», – сцвярджае С. Д. Домнікаў [3, с. 107–108].

Разам з тым М. Эліядэ, спасылаючыся на фундаментальную працу Дж. Фрэзера («Залатая галіна. Даследаванне магіі і рэлігіі»), прыйшоў да высновы, што іерафанія другога спадарожніка Зямлі – Месяца таксама была ў значнай часткі народаў свету прынцыпова важным касмічным метраномам. Пры гэтым асноўным фактарам уключанасці іерафаніі Месяца ў сістэму злічэнняў быў той феномен, што ў адрозненне ад вечна пастаяннага, самадастатковага Сонца Месяц кожныя сем дзён змяняў канфігурацыю бачнай зямлянам часткі. Месяц заўсёды рухомы, непастаянны, зменлівы, што дазваляла вылучыць адпаведныя працягласці, якія таксама зафіксаваны ў якасці апорных рытмаў у сельскагаспадарчай дзейнасці чалавека. «Калі мы хочам, – пісаў М. Эліядэ, – адлюстраваць шматлікасць месяцовых іерафаній у адной формуле, можам сказаць, што яны выяўляюць жыццё, якое рытмічна паўтараецца. Уся каштоўнасць Месяца, касмаганічная, магічная, або рэлігійная, тлумачыцца мадальнасцю яго быцця, тым фактам, што ён «жыве» і невычарпальны ў сваім абнаўленні» [6, с. 157].

Такім чынам, антрапакосм этнакультурнай традыцыі ёсць не што іншае, як канцэптуалізацыя метатэксту архаічных міфаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

першастварэння, які пастаянна адлюстроўвае космапланетарную цыклічнасць і падтрымлівае гармонію існавання як гаранта захавання свету. Усе сферы жыццядзейнасці чалавека не толькі суадносяцца з цыклам каляндарных падзей, але праз актуалізацыю адпаведных рытуалаў падтрымліваюць цэлакупнасць часавай ракі Вечнасці.


*1.* Балады : у 2 кн. / Акад. навук БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: В. К. Бандарчык [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1977–1978. – Кн. 1. – 1977. – 782 с.

*2. Виноградов, В. В.* О языке художественной прозы : избр. тр. / В. В. Виноградов. – М. : Наука, 1980. – 360 с.

*3. Домников, С. Д.* Мать-земля и Царь-город: Россия как традиционное общество / С. Д. Домников. – М. : Алетейа, 2002. – 671 с.

*4. Хюбнер, К.* Истина мифа / К. Хюбнер ; пер. с нем. И. Касавина. – М. : Республика, 1996. – 448 с.

*5. Элиаде, М.* Аспекты мифа / М. Элиаде ; пер. с фр. В. Большакова ; коммент. Е. Строгановой. – М. : Инвест-ППП, 1995. – 239 с.

*6. Элиаде, М.* Очерки сравнительного религиоведения / М. Элиаде ; пер. с англ. ; отв. ред. В. Я. Петрухин. – М. : Ладомир, 1999. – 488 с.

*7. Элиаде, М.* Священное и мирское / М. Элиаде ; пер. с фр., предисл. и коммент. Н. К. Гарбовского. – М. : МГУ, 1994. – 144 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ


***Д. И. Косьяненко,***
*мастер производственного обучения,*
*кафедра белорусской и мировой*
*художественной культуры*
*Белорусского государственного*
*университета культуры и искусств*


## ГРИМЕРНОЕ ИСКУССТВО Г. В. ВОЛКОВА В БЕЛОРУССКОМ ГОСУДАРСТВЕННОМ ТЕАТРЕ В ПЕРВОЙ ПОЛОВИНЕ XX в.

На базе творческого состава первого белорусского товарищества драмы и комедии в 1920 г. создан Белорусский государственный театр (ныне Национальный академический театр им. Янки Купалы). Новое здание драматического театра была торжественно открыто 14 сентября 1920 г.

Режиссерами Л. М. Литвиновым (1899–1963) и П. А. Даниловым (1898–1950) в 1932 г. на сцене БГТ-1 был поставлен